# Правілы развядзення вогнішчаў



Як часта выбіраючыся на прыроду, мы прывыклі разводзіць вогнішча для прыгатавання шашлыкоў або проста для сагрэва прахалодным вечарам. Седзячы вакол вогнішча, ствараецца атмасфера ўтульнасці нават удалечыні ад цывілізацыі. Але часцяком развядзенне вогнішчаў у многіх месцах забаронена законам. Таму, прышоўшы ў лес, неабходна памятаць аб правілах пажарнай бяспекі, каб не нашкодзіць прыродзе і не “нарвацца” на штраф.

Прыйшоўшы ў лес пераканайцеся, што на дадзенай тэррыторыі развядзенне вогнішчаў дазволена. Шмат якіх тэррыторый нашай краіны належаць запаведнікам. Разводзіць вогнішча тут катэгарычна забаронена.

Нагадваем вам асноўныя правілы, неабходныя пры развядзенні вогнішчаў:




- Развесці вогнішча дазваляецца толькі тады, калі няма ветру.
- Неабходна ўвесь час знаходзіцца каля разведзенага вогнішча.
- Побач мець вогнетушыцель, альбо лапату, альбо вядро з вадой, каб пры неабходнасці вогнішча затушыць.
- Ведайце, что разводзіць вогнішча дазваляецца на адлегласці 8 метраў ад будынкаў, 20 метраў ад лясоў і 30 – ад сціртаў сена і саломы.
- Забаронена разводзіць вогнішча ў іглічных маладняках, побач з дрэвамі, на лесасеках, на тарфяніках і ўчастках з сухой травой, мохам, на лесапасадках.
- Пакідаючы месца адпачынку абавязкова затушыце вогнішча!
- Памятайце, калі ўсталявалася на доўгі час сухое надвор’е, заканадаўствам можа быць забаронена наведванне лясоў. Аб гэтым вы можаце даведацца ў мабільным прыкладанні “МНС Беларусі. Дапамога побач!” У гэты час катэгарычна забараняецца не толькі разводзіць вогнішчы, але наогул наведваць лясныя масівы.

За развядзенне вогнішчаў у забароненых месцах прадугледжаны штраф да дванаццаці базавых велічынь. За выпальванне сухой расліннасці, траў на корані, а таксама іржышча і пажніўных рэшткаў на палях альбо непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў – ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь.